2. Гагарских М.М. Способы привлечения абитуриентов в отраслевые высшие учебные заведения / М.М. Гагарских, Е.А. Тукова // Научные исследования: теория, методика и практика : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Чебоксары: ЦНС «Интерактив плюс», 2017. – С. 117-119 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://interactive-plus.ru/ru/article/461445/discussion_platform. – Дата доступа: 14.03.2022.
3. Гдалина, Т.Г. О деятельности университета по привлечению абитуриентов / Т.Г. Гдалина, М.Ю. Челпанов // Universum: Вестник Герценовского университета, 2010. – С. 26-29 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/o-deyatelnosti-universiteta-po-privlecheniyu-abiturientov. – Дата доступа: 15.03.2022.
4. Технологии дополненной реальности в сфере образования [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://kvantorium37.ru/texnologii-dopolnennoj-realnosti-v-sfere-obrazovaniya. – Дата доступа: 14.03.2022.
5. Что такое дополнительная реальность? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://arnext.ru/dopolnennaya-realnost. – Дата доступа: 15.03.2022.

Левчик К.А., студент 119 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Зеневич В.К.,
доцент, профессор кафедры

## ТРАДЫЦЫЙНАЯ ПЕСЕННАЯ КУЛЬТУРА АГРАГАРАДКА СКІРМАНТАВА ДЗЯРЖЫНСКАГА РАЁНА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Актуальнасць даследвання.** Аграгарадок Скірмантава з’яўляецца месцам, дзе і па сённяшні дзень захаваліся старажытныя абрады амаль у першапачатковым выглядзе. Ад старэйшага пакалення абрады пераходзяць

да моладзі, якая займаецца у мясцовым Доме культуры і засвойвае народныя традыцыі. Песенная спадчына аграгарадка амаль не вядомая беларускім этнамузыколагам. Пра гэта сведчыць адсутнасць публікацый, прысвечаных традыцыйнай песеннай культуры Скірмантава, таму яе даследванне ўяўляецца вельмі актуальным, яно можа стать добрым пачаткам працы па вывучэнні, захаванні і дальнейшым развіцці багатых фальклорных традыцый гэтага локусу.

**Мэтай даследвання** з'яўляецца вывучэнне традыцыйнай песеннай культуры аграгарадка Скірмантава Дзяржынскага райна Мінскай вобласці.

**Аб'ектам даследвання** з'яўляецца аграгарадок Скірмантава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці.

**Прадмет даследвання** – традыцыйная песенная культура аграгарадка Скірмантава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці.

**База даследвання** – традыцыйны фальклорны ансамбль "Скірмантаўскія сваякі" Скірмантаўскага дому культуры.

**Метады даследвання.** Эмпірычны — (назіранне, апытанне ў працэсе экспедыцыйнай працы). Тэарэтычныя — культурна-гістарычны, метады аналізу і сінтэзу, метад структурна-тыпалагічнага аналізу фалькларыстычных матэрыялаў.

Матэрыялы даследвання могуць быць выкарастаны для дальнейшых навуковых пошукаў у галіне беларускай музычнай фалькларыстыкі, на занятках па этнаграфіі і народна-песеннай творчасці ва ўстановах адукацыі сярэдняга і вышэйшага звяна.

Аграгарадок Скірмантава (раней вёска Скірмунты) знаходзіцца ў 18 км. на паўночны захад ад горада Дзяржынск і ў 32 км. на паўднёвы захад ад цэнтра Мінска.

Найбольш верагоднай версіяй паходжання назвы вёскі з'яўляецца паданне, якое змешчана ў зборніку "Міншчына" (складальнік – Ненадавец А.М. 1998г.). Паданне гучыць наступным чынам: **"**Жыў даўнавата ў нашай

вёсцы адзін гаспадар з жонкай. Расла ў іх адна толькі дачка. Звалі яе Марынай. Пачалі бацькі сватоў прысылаць, але Марынка ўсім адмаўляла. Жала яна аднаго дня з матуляй жыта, ды пад’ехаў да іх хлопец вады запытаць. Гаворыць, ды з Марынкі вачэй не спускае. Маці запытала хлопца: “Адкуль ты, хлопец, у нашых палях апынуўся?” Хлопец адказаў: “Мы жывем далей, наасобку, скірмунтамі”. А потым прыслаў сватоў і забраў яе ў сваю вёску. Населішча ад таго хлопца і назвалі Скірмунты”.

У літоўскім сучасным слоўніку – “skyrium” азначае “асобны”. Таму не выключана, што першымі жыхарамі Скірмунтаў былі балты. Аб гэтым сведчыць таксама балцкае паходжанне назвы суседняй вёскі (Нарэйкі) і шмат якіх навакольных вёсак побач. Верагодна, што менавіта нейкае балцкае імя надало назву вёсцы.

Цэнтрам захавання і развіцця песеннай культуры аграгарадка Скірмантава з’яўляецца Скірмантаўскі дом культуры, дырэктарка якога - Наталля Пятроўна Рэдзько. На яго базе існуе сямейны ансамбль “Скірмантаўскія сваякі”, які быў створаны ў 1987 годзе Софьяй Адольфаўнай Рэдзько – свякроўю Наталлі Пятроўны. Сёння ў складзе ансамбля шэсць чалавек: Наталля Пятноўна Рэдзько (дырэктар ДК), Андрэй і Станіслаў Рэдзько (ўнукі), Аляксандра Апенка (ўнучка), Марына Рэдзько (нявестка), Стэпан Рэдзько (праўнук). Гэта сямейны ансамбль. У яго рэпертуары песні розных гісторыка-стылявых пластоў і жанраў - калядныя (“Ах, калядныя, бліны ладныя”, “Будзь ваша здароў, як рыжык бароў”), жніўныя (“Зялёнае жыта, зялёна”), карагодныя (“Ой, чарачка-мерачка, ой, медавая”, “Як прыйшоў, як прыйшоў, казёл пад аконца”), узоры пазаабрадавай песеннай лірыкі - “Дробна драбніца”, “Ой, у лесе, лесе, ды мядзведзь рыкае”, “У полі бяроза”, “Ляцеў галуб” і інш.

Аграградок Скірмантава з’яўляецца месцам, дзе і па наш час захаваліся амаль ўсе старажытныя абрады (Каляды, Гуканне вясны, Масленіца, Купалле і інш.), але больш за ўсё Скірмантава можа ганарыцца абрадам

**“Ката пячы”**, які ўвашоў у спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі.

Соф'я Рэдзько (жыхарка в.Скірмантава, мастацкі кіраўнік Скірмантаўскага ДК) яшчэ ў 1980-я гады ініцыявала адраджэнне абраду "Ката пячы". Пра тое, як у часы яе маладосці ўся радня ўдзельнічала ў гульні, жанчына расказала сваёй ятроўцы Наталлі Рэдзько ( дырэктарка Скірмантаўскага ДК з 1986 г.). Разам яны вырашылі аднавіць даўнюю традыцыю. “Кот – ахоўнік сям'і і шлюбнага ложка. А праз з'яданне частак “ката” людзі заручаюцца падтрымкай на дабрабыт, – тлумачыць Наталля Рэдзько. – Гэта робіцца, каб усё было добра, каб у сям'і ўсё ладзілася”.

Абрад “Ката пячы” з’яўляецца энтралізуючым кампанентам музычнай традыцыі аграгарадка Скірмантава. Перыяд правядзення абраду – напярэдадні Каляднага посту. Гульня дапамагае ўдзельнікам маральна падрыхтавацца да абмежаванняў у ежы. На стол падчас мерапрыемства ставяць менавіта скаромныя стравы: тыя, што наступныя 40 дзён будуць пад забаронай.

“Раней «ката» пяклі падчас гульні. Сёння лапкі, тулава і галаву я раблю ў сваёй духоўцы, у клуб нясу ўжо гатовыя. Яшчэ мне трэба падсмаліць каўбасны хвост, а вось збіраюць «ката» ўжо на гульні. Гэтым займаецца наш званы гаспадар Сяргей, а я дапамагаю. Калі «кот» гатовы, вяжу яму стужачку на шыю, каб было прыгожа. А потым мы падвешваем яго на вяроўку” – распавядае Наталля Рэдзько.

Вушы "кату" робяць з сала, хвост – з падсмажанай хатняй каўбасы. Замест вачэй выкарыстоўваюць разынкі, замест рота – лупіну памідора. Нос робяць з морквы.

У той час як гаспадыня і гаспадар пякуць і сабіраюць ката, ўсе астатнія ўдзельнікі гульні пад кіраўніцтвам свахі танчуць мясцовыя танцы (“Падыспан”, “Кракавяк”, “Ночка”, “Полька” і інш.), гуляюць у гульні (“Раменчык”, “Дзяркач” і інш.) і, час ад часу, пытаюцца ў гаспадара “Ці

спёкся кот?”. Калі кот гатовы, гаспадар і гаспадыня выносяць ката са словамі “Мы ад печы да кута нясем лысага ката”. З гэтага пачынаецца галоўная гульня абраду, якая праходзіць наступным чынам. Аднаму з гасцей даюць качаргу і адводзяць яго да парога пакоя. Іншыя гульцы тым часам становяцца каля “ката”, каб яго абараняць: не даць быць з'едзеным. Госць, «асядлаўшы» качаргу, бяжыць да пірага са словамі «Ад парога ды кута еду па лысага ката!», спрабуе адкусіць кавалачак. Калі не ўдалося, у якасці пакарання гулец павінен выканаць задання: напаіць жураўля, сарваць вішаньку, палаяць сабакам і інш. Самай галоўнай часткай ката з’яўляецца хвост, які зроблены са свойскай каўбасы. Той, у каго атрымаецца адкусіць кусок хваста, таму будзе шансаваць увесь наступны год. Калі ўсе паспрабавалі пад’ехаць да ката, яго здымаюць і падзяляюць паміж усімі ўдзельнікамі гульні.

Традыцыйная песенная культура аграгарадка Скірмантава шырока прадстаўлена як каляндарна-абрадавым і сямейна-абрадавым фальклорам, так і пазаабрадавай лірычнай песняй. Да прыкладу, дзеянні абраду “Ката пячы” суправоджваюцца вялікай колькасцю пазаабрадавых песень, сярод якіх “Дробна драбніца”, “Ой, у лесе, лесе, ды мядзведзь рыкае”, “Ой, чарачка-мерачка, ой, медовая” і інш.

Маючы ўнікальны характар, аграгарадок, у той самы час адлюстроўвае асаблівасці, спецыфічныя для Цэнтральнага рэгіёну Беларусі ўцэлым. Пры вызначэнні традыцыйных этнафанічных і музычна-стылістычных прыкмет Цэнтральнай Беларусі, трэба абазначыць, што традыцыйную культуру варта разглядаць як зону “на скрыжаванні” рэгіянальных культур суседніх этнаграфічных рэгіёнаў. Такім чынам, Міншчына не ўяўляе сабой замкнёны культурны рэгіён, а ўбірае ў сябе розныя этнакультурныя традыцыі, у асобных арэалах – у іх скрыжаванні і ўзаемапранікненні.

На тэрыторыі паўночна-заходняй часткі Цэнтральнай Беларусі мы сустракаемся з тым самым стылем антыфонных спеваў, які характэрны для песеннай традыцыі Беларускага Паазер’я, якое мяжуе з паўночнымі

тэрыторыямі Цэнтральнай Беларусі. Самі народныя спевакі вызначаюць гэты стыль, як "песні з адпевам", спевы "на дзве (тры) пары", "на дзве (тры) змены", гэта такія спевы, калі ансамбль выканаўцаў падзяляецца на дзве-тры пары ці групы, якія па чарзе выконваюць кожную песенную страфу. Асаблівую прыгажосць антыфонным спевам надае такі прыём выканання, калі папярэдняя група доўга цягне заключны гук напеву, а наступная "накладвае" пачатак паўтору на гэты працяглы гук. У такім стылі выконваюцца абрадавые песні каляндарнага і сямейнага цыклаў.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Варфаламеева Т.Б., Басько В.І., Валодзіна Т.В. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Том 5. Центральная Беларусь // Мінск "Вышэйшая школа". – 2010.
2. Ліцвінка В.Д. Беларускі фальклор ў сучасных запісах: традыцыйныя жанры/Мінская вобласць // Мінск "Універсітэцкае". – 1995.
3. Цитоў В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі. // Выдавецтва "Беларусь". – 1996.
4. Архіў запісаў Скірманскага дома культуры
5. Вусныя апытванні жыхароў аграгарадка Скірмантава

Леппо А. С., студент 320с группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Чурко Ю.М.,
доктор искусствоведения, профессор

**ХОРЕОГРАФИЧЕСКИЕ ОТКРОВЕНИЯ СИМОНЕ ВАЛАСТРО**